украинское движение будет смотреть против России, и это поддержит борьбу поляков с русскими. Политики Украины имели другой взгляд: вместо того, чтобы противостоять более сильному и более грозному врагу, каким была Россия, они решили направить все свои молодые силы против более слабого противника, каким были поляки в Галиции. Так случилось, что поляки сознательно зажгли сильный костер национального украинского движения. Украинские националисты надеялись быстро победить Польшу, а далее, закрепив успехи и окрепнув, направить все свои силы против России [1, с. 211, 219].

Пророчество Здзеховского вскоре сбылось. Уже в межвоенный период выросло украинское националистическое движение, особенно в Восточной Галиции. Его идеолог Дмитрий Донцов проповедывал, что Украина там, где проживает хотя бы одна украинская семья, а его последователи Степан Бандера и Роман Шухевич призывали бороться с поляками. В начале Второй мировой войны украинцы передали списки знаменитый поляков (профессоров университета Яна Казимира во Львове) в гестапо и сами образовали дивизии, сотрудничающие с гитлеровцами СС «Галичина». Образованная Украинская повстанческая армия и Организация украинских националистов основной целью ставила очистить Восточную Галицию от поляков. Геноцид, так надо назвать действия УПА на территории Восточной Галиции (Волыни и Подолья), характеризовался невообразимой жестокостью. Следует отметить, что после распада СССР Украинское государство и дальше продолжает придерживаться традиций УПА и ЮОН. До сих пор не покаялись за преступления геноцида, а считают своими героими Романа Шухевича и Степана Бандеру. Декларация украинских руководителей о претензиях на польские территории городов Хелма, Пшемысля и даже Кракова вызывают опасения. Если мы познакомимся со словами украинского гимна, то во второй строфе есть слова о границе на р. Сане. Это значит, что польские земли, лежащие до реки Сан, хотят отобрать у Польши. Более того, украинские руководители домогаются земель Беларуси: Бреста с окрестностями и Гомельской области. Видно, что рассматрение украинского вопроса Марианом Здзеховским – это политическая дальнозоркость. Он опередил свое время, исследовал события начала XIX в. и очень точно сделал политические прогнозы, которые свершаются до настоящего времени.

Список использованных источников

1. *Zdziechowski, M.* Widmo przyszłości, Rosja. Bolszewizm, Polska / M. Zdziechowski. – Warszawa: W-wo GŁOS, 1985.
2. *Zdziechowski, M.* W obliczu końca / M. Zdziechowski. – Warszawa – Ząbki: Apostolicum, 1999.
3. *Zdziechowski, M.* Tragedia Kresów / M. Zdziechowski. – Warszawa: Maraton, 1989.
4. Zbigniew Opacki – Między uniwersalizmem a partykularyzmem. Myśl i działalność społeczno-polityczna Mariana Zdziechowskiego 1914–1938, Wydawnictwo Uniwersytetu Gdańskiego , Gdańsk 2006.

(Дата подачи: 13.02.2015 г.)

В. А. Валадковіч
Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы, Мінск
V. A. Valadkovich
National Institute of Higher Education, Minsk

УДК 94(476) «14/15»

«CRIMEN MAJESTATIS» (АБРАЗА МАЕСТАТА) У ПРАВАВОЙ СІСТЭМЕ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА XV–XVI СТАГОДДЗЯЎ

«CRIMEN MAJESTATIS» (OBRAŻENIE MAIESTATA) IN THE LEGAL SYSTEM OF THE GRAND DUCHY OF LITHUANIA IN XV–XVI SS.

У артыкуле разглядаецца прававы інстытут «crimen majestatis» (абраза маестата) у прававой сістэме Вялікага Княства Літоўскага ў XV–XVI стст., шляхі рэцэпцыі дадзенага прававога прынцыпу, эвалюцыя яго тэрміналогіі і сутнасці на працягу вызначанага перыяду на падставе галоўных заканадаўчых крыніц, паказаны яго генэзіс, прааналізавана ступень уплыву прававых сістэм іншых дзяржаў на фарміраванне адпаведнага прававога прынцыпу ў Вялікім Княстве Літоўскім, вылучаны яго запазычаныя і арыгінальныя рысы.

Ключавыя словы: абраза маестата; манарх; Вялікае Княства Літоўскае; Статут; crimen laesae majestatis (crimen maiestatis); прававая сістэма; рэцэпцыя; вялікі князь (Гаспадар).

The article is devoted to review of legal institution of the «crimen majestatis» (obrażenie maiestata) in the legal system of the Grand Duchy of Lithuania in XV–XVI ss.). It is considered the ways of borrowing of this legal principle, the evolution of its terminology and essence during the selected period of time on the basis of the main legislative sources. It is showed the genesis of legal institution of the «crimen majestatis» (obrażenie maiestata), analized the degree of the influence of the legal systems of other states on the formation of the relevant legal principle in the Grand Duchy of Lithuania, marked its borrowed and original features.

Key words: insult of majesty; monarch; The Grand Duchy of Lithuania; Statute; crimen laesae majestatis (crimen maiestatis); legal system; reception; Grand Duke (Ruler).

Абраза асобы манарха з'яўлялася адным з самых сур'ёзных злачынстваў у прававой сістэме Вялікага Княства Літоўскага (далей – ВКЛ). Упершыню ў заканадаўстве яно вылучаецца як асобны від злачынства ў Прывілеі вялікага князя Аляксандра 1492 г. пад тэрмінам «crimen laesae maiestatis» (злачынства зневажэння вялікасці) [1, с. 221]. Далей пытанне абразы манарха больш падрабязна акрэсліваецца ў Статутах ВКЛ. У Статуце 1529 г. выкарыстаны тэрмін «ображене маистату его милости» [2, с. 2]. Падобная фармуліроўка захавана ў Статуце 1566 г. («ображенье маестату нашого господарского») і ў Статуце 1588 г. («маестату нашого господаръского ображенье») [3, с. 16; 4, с. 3]. Фактычна, у Статутах выкарыстоўваецца лацінскі тэрмін у перакладзе на старабеларускую мову, што сведчыць пра перайманне тэрміналогіі з рымскага права [5, с. 163].

У сістэме права старажытнага Рыма асаблівае значэнне надавалася бяспецы дзяржавы. Таму найбольш важным законам, за які прадугледжвалася самае суровае пакаранне, стаў закон аб абразе вялікасці («crimen laesae majestatis»). Ён трактаваўся як злачынства супраць рымскага народа і яго бяспекі [6, с. 408]. Гэты закон ахопліваў шэраг злачынстваў, якія можна было вызначыць як дзяржаўная здрада ці замах на існуючы дзяржаўны лад. У рэспубліканскі перыяд народ з'яўляўся непасрэдным носьбітам дзяржаўнага верхавенства, дзяржаўнай «вялікасці» («majestas»). Менавіта абраза народа кваліфікавалася як «абраза вялікасці», як «crimen laesae majestatis» («crimen maiestatis») [7, с. 50].

У імперскі перыяд гісторыі Рыма, непасрэдна ў часы кіравання імператараў з дынастыі Юліяў-Клаўдзіеў (да сярэдзіны I ст. н. э.), змест тэрміна «crimen majestatis» змяняецца. Пад гэты закон, створаны ў эпоху рэспублікі для абароны важнейшых дзяржаўных інтарэсаў, пры імператары Тыберыі пачынаюць падводзіць розныя ўчынкі і палітычныя дзеянні, накіраваныя непасрэдна супраць імператарскай асобы [8, с. 47–48]. Тым не менш афіцыйна імператар па-ранейшаму атаясамліваецца з рымскім народам, выступае як вышэйшая службовая асоба, таму фактычна галоўнае значэнне «crimen majestatis» захоўваецца [9, с. 120].

У сваім класічным выглядзе закон «crimen laesae majestatis» захаваўся ў візантыйскім праве (Дыгесты Юсцініана, Эклога, Прахірон і інш.). Фактычна ён цалкам адпавядаў рымскаму разуменню дадзенага прававога інстытута. Як адзначаюць крыніцы, злачынствам супраць вялікасці з'яўлялася тое, што здзяйснялася супраць народа ці супраць яго бяспекі. Пад такімі злачынствамі разумеўся даволі шырокі спектр дзеянняў: аб'яднанне групы людзей з баявой зброяй з мэтай выступлення супраць дзяржавы, заняцце імі храмаў ці грамадскіх устаноў, заклік да паўстання і г. д. [10, с. 34–38].

Паступова адбываецца ўзмацненне ўлады імператара. У дзяржаўна-прававой сістэме Візантыі манарх пачынае займаць важнейшае месца, ён засяроджваў у сваіх руках усю заканадаўчую, судовую і адміністрацыйную ўладу без абмежаванняў, асоба імператара ўвасабляе сабой самога Хрыста [11, с. 41; 12, с. 15–16]. У той жа час імператар павінен быў абараняць і выконваць законы, у іншым выпадку грамадзяне мелі права пазбавіць яго ўлады [13, с. 17–18]. Злачынствы супраць імператара пачынаюць выступаць як дзяржаўныя: паўстанне супраць імператара, змова супраць яго [10, с. 34–38; 14, с. 68].

Такім чынам, у прававых сістэмах Старажытнага Рыма і Візантыі тэрмін «majestatis» першапачаткова азначаў вялікасць і святасць Бога, затым – вялікасць усяго народа і толькі ў далейшым стаў характарызаваць вялікасць манарха (імператара), атрымаўшага ад Бога ўладу і права выражаць інтарэсы ўсіх грамадзян.

Злачынствы, звязаныя з абразай манарха, утрымліваліся і ў прававой сістэме Старажытнай Русі, якая фарміравалася пад значным уплывам візантыйскага права. Так, Кормчыя кнігі, якія ўтрымлівалі нормы царкоўнага права, вылучаюць у якасці злачынства нават славесную абразу князя ці ганьбу яго ўчынкаў [15]. У той жа час «Руская праўда» яшчэ не ўтрымлівае такую катэгорыю як дзяржаўныя злачынствы і нормы пакарання за іх; учынкі супраць князя каралі расправай на месцы [16, с. 32]. У выніку працэсаў цэнтралізацыі дзяржавы і ўзмацнення манархічнай улады Судзебнік 1497 г. ужо прызначае смяротнае пакаранне за крамолу, пад якой разумеўся замах на дзяржаўны лад ці асобу манарха, і падым (уздым народа на паўстанне) [17, с. 55]

Рымскае права займала выключнае становішча ў сярэднявечнай прававой сістэме Заходняй Еўропы. З'яўляючыся сінтэзам усяго юрыдычнага вопыту антычнага свету, яно было пакладзена ў аснову прававых норм усіх заходнееўрапейскіх дзяржаў і лічылася эталонам.

ВКЛ знаходзілася паміж заходнееўрапейскім светам і Усходам, што прыводзіла да пастаянных узаемаўплываў з абодвух бакоў. Аднак пашырэнне і ўзмацненне сувязяў з Польшчай паступова ўсё больш уцягвала ВКЛ у заходнееўрапейскую сферу ўплыву. Падобная сітуацыя датычылася і прававой сістэмы. Ужо ў прававых крыніцах XIV–XV стст. сустракаюцца прыклады рэцэпцыі норм рымскага права, якія маглі быць перайманы з Германіі ў Польшчу, а адтуль – у права ВКЛ [18, с. 67]. У сваю чаргу на польскае права аказала значны ўплыў права нямецкае. У XV–XVI стст. на тэрыторыі Каралеўства Польскага шырокае распаўсюджанне атрымала «Саксонскае зерцала», якое ў Заходняй Еўропе атрымала статус эталона пры складанні мясцовых прававых кодэксаў. У Польшчы дадзены прававы зборнік быў вядомы ў лацінамоўным выданні Н. Яскера «Зерцала саксонаў» (1535). У 1535 г. Жыгімонт I Стары абвясціў гэты прававы звод законам і афіцыйнай юрыдычнай крыніцай. У ім падаецца складаная структура прынцыпу «majestatis» (вялікасць і святасць Бога – вялікасць усяго рымскага народа – вялікасць манарха (імператара) як выразніка інтарэсаў народа, які атрымаў уладу ад Бога), цалкам перанятая з сістэмы рымскага права [19, s. 143, 212]. У 1539 г. канстытуцыя Кракаўскага сойма дакладна вызначыла сутнасць інстытута «crimen laesae majestatis»: дзеянні, накіраваныя непасрэдна супраць кіраўніка [20, s. 270]. Сюды таксама можна было аднесці злачынствы супраць непасрэдна каралеўскай асобы (парушэнне яго загадаў, абраза ўрадніка і г. д.), для якіх быў выпрацаваны асобны тэрмін – «levipendium Regiae Maiestatis» [21, s. 37].

У той жа час, як адзначаюць даследчыкі, шматлікія нормы рымскага права былі рэцэпіраваны ў права ВКЛ раней, чым у права Германіі і Польшчы, праз сербскія прававыя крыніцы («Номаканон») [18, с. 68]. Тым не менш нельга адмаўляць і заходнееўрапейскі кірунак рэцэпцыі рымскіх прававых норм, у першую чаргу праз Італію. Тут склалася асобная школа рымскага права ў Балонскім універсітэце, куды з'язджаліся студэнты з розных краін Заходняй і Усходняй Еўропы, у тым ліку і ВКЛ. Балонскую традыцыю

працягнулі і іншыя юрыдычныя школы Францыі і Італіі, у якіх навучаліся і прадстаўнікі літоўскай знаці. Акрамя таго, на тэрыторыі ВКЛ нярэдка сяліліся выхадцы з Заходняй Еўропы [22, с. 71]. Як адзначае Ю. Бардах, асабліва моцны ўплыў рымскага права на літоўскае адбыўся ў перыяд Адраджэння [23, s. 71–93]. Пра перайманне заходнееўрапейскіх прававых традыцый сведчыць Статут 1529 г., калі ў прэамбуле ад імя Гаспадара насельніцтва «хотячи обдаровати правы крестьянскими», а таксама ў першым раздзеле ўтрымліваецца абяцанне караць толькі пасля разгляду спраў у судзе «водле звычаю и прав хрестьянских» [2, с. 436]. Пад хрысціянскім правам разумеліся прававыя нормы, заснаваныя на рымскім праве, якія выкарыстоўваліся ў Польшчы і Германіі [24, с. 4].

Аднак нельга казаць аб поўнай пераемнасці рымскіх прававых норм у сістэме права ВКЛ. Рымскае права выкарыстоўвалася толькі як прыклад і ўзор, рэцэпцыя праходзіла добраахвотна і выбаркова, у выніку чаго прынятыя нормы прыстасоўваліся да мясцовых асаблівасцяў з улікам існуючых прававых традыцый. Пра гэта сведчыць той факт, што сам рымскі тэрмін «crimen laesae majestatis», трапіўшы ў прававую сістэму ВКЛ і захаваны ў аўтэнтычным выглядзе, значна змяніў сваю сутнасць.

У Статутах ВКЛ у адносінах да злачынстваў супраць палітычнага ладу дзяржавы выкарыстоўвалася агульная форма назвы «ображенье маестату нашого господарского». Нягледзячы на рэцэпцыю, лацінамоўны варыянт тэрміна Статуты не выкарыстоўвалі. Як адзначаў вядомы даследчык права І. А. Юхо, «у адрозненне ад Заходняй Еўропы, дзе карысталіся рымскім правам, выкладзеным на незразумелай для многіх лацінскай мове, тэкст Статута быў зразумелым пераважнай большасці мясцовага насельніцтва» [25, с. 28].

Пры стварэнні Статутаў іх аўтары імкнуліся да як мага больш дакладнага перакладу. Але калі для лацінскага тэрміна «crimen» знайшоўся адпаведны аналаг – «абраза» («ображенье», «зражене»), то ў адносінах да тэрміна «majestatis» склалася іншая сітуацыя. У старабеларускай мове адсутнічаў тэрмін, які б мог дакладна адлюстраваць змест рымскага паняцця «majestas» – годнасць, вялікасць, святасць Бога ці народа, дзяржаўных інстытутаў [26, с. 8]. Таму для вызначэння зыходзячага ад Бога і адлюстроўваючага інтарэсы ўсяго народа вышэйшага прыярытэту была выкарыстана транскрыпцыя лацінскага тэрміна – «маестат».

Нягледзячы на перайманне рымскай тэрміналогіі, паняцце «ображенье маестату» ў ВКЛ атрымала зусім іншае ад рымскага права значэнне. У ВКЛ тэрмін «маестат» (вялікасць) прымяняецца толькі ў адносінах да манарха («маестат господарский») як адлюстраванне яго асобага статусу і паўнамоцтваў. Неабходна адзначыць, што ў дзяржаўна-прававой сістэме вялікі князь займаў галоўнае і важнейшае месца. Мы назіраем у ВКЛ такі феномен падзелу ўлад, які вылучаў з сістэмы дзяржаўнага кіравання галоўнага суб'екта – носьбіта заканадаўчай, судовай і выканаўчай улады – Гаспадара. Манарху належыць шырокае кола важнейшых дзяржаўных паўнамоцтваў:

права весці міжнародныя справы, уступаць у саюзы, абвяшчаць вайну і заключаць мір, распараджацца ўзброенымі сіламі дзяржавы, дзяржаўнай маёмасцю, даходамі і скарбамі, ажыццяўляць вышэйшы суд і памілаванне асуджаных і інш. Яму належала заканадаўчая ініцыятыва, усе асноўныя законы і прававыя акты выдаваліся за яго подпісам [27, с. 29]. Ажыццяўленне правасуддзя і арганізацыя судаводства таксама заставаліся адной з важнейшых функцый вялікага князя [28, с. 513, 514].

Так, паступова ў ВКЛ, падобна заходнееўрапейскім краінам і пад іх уплывам, складваецца вобраз манарха, які пачынае аддзяляцца ад непасрэдна асобы кіраўніка. У прававой тэорыі фарміруецца ўяўленне аб дваістасці вобраза манарха, у якім вылучаецца вялікі князь як асоба і сам вобраз манарха як палітычны інстытут [29, s. 5]. Лічылася, што ўлада гаспадара зыходзіла ад Бога, таму кожнае дзеянне супраць яго разглядалася як замах на яго ўладу і аўтарытэт. Нягледзячы на пастаянную тэндэнцыю да абмежавання ўлады манарха, інстытут вялікага князя захаваў, хоць часам толькі фармальна, свой выключны статус у палітычнай і сацыяльнай сістэме. Вобраз манарха выступае як выразнік інтарэсаў дзяржавы, як яе ўвасабленне і сімвал. Такім чынам, «маестат господарский» разглядаўся як важнейшы, асноўны элемент суверэнітэту манарха і яго дзяржавы, а «абраза вялікасці» – як замах на дзяржаўны суверэнітэт.

Паняцце абразы годнасці манарха пад тэрмінам «ображене маистату его милости» замацавана ў Статуце 1529 г. [2, с. 2]. Пад злачынствамі «абразы маестата» Першы Статут разумее ўцёкі да зямлі непрыяцеля: «Хто бы колве с подданных наших с панства нашого втек до земли неприятелей наших» [2, с. 2]. Падобны аспект разумення тэрміна ў рымскім праве адсутнічаў. У Старажытным Рыме да злачынстваў супраць маестата адносілі «perduellio» (вайну супраць рымскага народа), у тым ліку змову і дапамогу ворагу, але не ўцёкі на яго тэрыторыю [30, с. 403]. Аднак падобны прынцып утрымліваецца ў польскіх Вісліцка-Петрыкаўскіх Статутах 1346–1347 гг., па якіх належыць канфіскацыі маёмасць тых, хто ўцёк за мяжу, а таксама здраднікаў. Але пакаранне выкарыстоўвалася толькі ў тым выпадку, калі пабег прычыняў шкоду дзяржаве ці яе жыхарам: «Aliqua nocumenta Regno, vel terrigenis intulerit … si vero malitiose» («Якую-небудзь шкоду Каралеўству, ці краю ўчыніў … але калі на самай справе зламысна») [20, s. 21]. У той жа час «Саксон» Н. Яскера ўжо адносіць пабег на бок ворага і дапамогу яму да «crimen majestatis»: «Vel qui ad hostes profugit, vel ipsos qualitercumque iuvat, scilicet armis, vel pecunia, vel consilio» («І тых, хто уцёк да ворага, ці сам як-небудзь дапамагае, а менавіта зброяй, ці грошамі, ці парадай») [19, s. 212]. У сваю чаргу Статут 1529 г. прыраўноўвае ўцёкі да непрыяцеля да абразы манарха, нягледзячы на іх мэты і наступствы. Таму і пакаранне за пабег прызначаецца вельмі значным: канфіскацыя маёмасці і страта гонару [2, с. 2].

Другім злачынствам, якое абражае годнасць вялікага князя, Статут 1529 г. лічыць зневажэнне гаспадарскага ўрадніка ці пасланца, пад чым разу-

мелася збіццё, зраненне ці гвалт у час выканання ўраднікам сваіх абавязкаў: «Коли бы который подданый наш врадника нашего…зкгвалтовал, зранил або збил…так, как бы маестат наш господарский образил» [2, с. 3–4]. Такім чынам, ураднікі выступаюць як непасрэдныя выканаўцы волі правіцеля, носьбіты часткі яго ўлады, з яго ласкі трымаюць свой урад, таму іх абраза лічыцца абразай волі Гаспадара, замах на яго ўладныя паўнамоцтвы.

Статуты 1566 і 1588 гг. больш падрабязна і дакладна акрэсліваюць разуменне паняцця «абраза маестата». Да гэтай катэгорыі ўжо адносяцца не толькі ўцёкі да непрыяцеля, але і цэлы шэраг іншых злачынстваў. Уцёкі да ворага па-ранейшаму лічацца злачынствам супраць маестата, аднак ужо толькі пры некаторых умовах: калі мэтай уцёкаў з'яўляецца шкода і здрада дзяржавы: «Утек … умыслом злым на здраду ку шкоде нам господарю и речы посполитой» [3, с. 18; 4, с. 6]. Такім чынам, Статуты фактычна цалкам пераймаюць падобны прававы прынцып польскага права, змешчаны ў «Саксоне».

Упершыню Статут 1566 г. адносіць да абразы маестата дзеянні, звязаныя з замахам на жыццё і здароўе асобы манарха. Гэта «змова албо спикненье албо бунт» супраць вялікага князя. Прычым злачынствам лічыўся не толькі сам факт бунта, але і нават намер яго здзейсніць: «Иж бы оная змова не была учынком пополнена» [3, с. 16]. Падобны прынцып утрымліваў і «Саксон» Н. Яскера, але ў больш агульнай форме «opponendo et moliendo contra principem» (супраціў і змова супраць Гаспадара), пад якую можна было падвесці любое злачынства супраць манарха [19, s. 212]. Статут 1588 г. таксама захоўвае гэта палажэнне [4, с. 3].

Да абразы манарха адносілася і завочная абраза Гаспадара [3, с. 482; 4, с. 4–5]. Пад ёй Статут 1566 г. разумее выказванні супраць Гаспадара: «А за обмовенье … о парсуне нашой господарской … маем карати» [3, с. 17]. Але такая фармуліроўка была занадта шырокай і магла трактавацца вельмі неадназначна. Таму Статут 1588 г. больш дакладна акрэслівае гэты від злачынстваў, адносячы да завочнай абразы вымаўленне абразлівых слоў аб манарху ці абраза яго асобы ў лісце: «Хто заочне што образливого о нас … мовил, и тежъ хто бы особу нашу … явне и через листы свои … шкалевал» [4, с. 5]. Статуты, праўда, адзначаюць, што дадзеныя дзеянні лічацца злачынствам толькі тады, калі абразлівая інфармацыя з'яўляецца хлуснёй. Але ці была магчымасць у абвінавачанага даказаць, што гэта праўда, і якім спосабам?

Наступная група злачынстваў датычылася вярхоўнай здрады, замаха на сацыяльна-палітычныя асновы дзяржавы [3, с. 16–17; 4, с. 554]. Перш за ўсё гэта бунт, паўстанне супраць вялікага князя як замах на яго ўладу і асновы грамадскай бяспекі [3, с. 16; 4, с. 3; 26, с. 13]. Па-другое, узброеная спроба дзяржаўнага перавароту, імкненне захапіць вярхоўную ўладу [3, с. 16; 4, с. 3]. Тут злачынны намер скіраваны на захоп вышэйшай улады, для чаго дастаткова знешніх дзеянняў – незаконнага збору ваеннай сілы, што і сведчыла пра благую задуму [31, с. 63].

Да абразы маестата Статуты 1566 і 1588 гг. адносяць і парушэнне фінансавых паўнамоцтваў манарха. Злачынцай з'яўляўся той, хто «мынцу без воли нашое бил явне» [3, с. 16; 4, с. 3]. Сутнасць дзеяння складалася з самавольнага прысвойвання вялікакняжацкага права чаканіць і ўводзіць у зварот манету. Менавіта падобнае дзеянне адкрытага, яўнага характару (у адрозненне ад фальшываманецтва) падкрэслівала яго накіраванасць супраць улады і адносілася да абразы маестата [31, с. 64].

Нарэшце, да абразы маестата Статуты 1566 і 1588 гг. адносяць земскую здраду і дапамогу ворагам. Да падобных дзеянняў адносяцца сувязі з непрыяцелем [3, с. 16; 4, с. 3]. Пад сувязямі Статуты разумеюць інфармацыйную дапамогу ворагу праз лісты ці агентаў (падбухторванне ворага да дзеянняў супраць дзяржавы, паведамленне дзяржаўнай таямніцы). Да абразы маестата адносіцца таксама здача ворагу крэпасці [3, с. 16; 4, с. 3]. Аднак Статут 1588 г. злачынствам лічыць толькі здачу з мэтай здрады, страта крэпасці ў бязвыхадным становішчы не адносіцца да злачынства [4, с. 555]. Акрамя таго, злачынцай прызнаваўся той, хто «люди непрыятельские в панство наше Великое Князство Литовское здрадливе привел» [3, с. 16; 4, с. 3]. Мяркуючы па тэксту Статутаў, менавіта два апошніх выпадкі разглядаліся як дзяржаўная здрада ў вузкім разуменні слова, аналагічна рымскаму «perduellio» [26, с. 14].

Такім чынам, прававая норма абразы вялікасці пад тэрмінам «crimen laesae majestatis» была сфармулявана ў рымскім праве і на працягу стагоддзяў змяніла сваё значэнне ад абразы рымскага народа да абразы імператарскай асобы. Пазней на аснове рымскага права былі сфарміраваны прававыя сістэмы еўрапейскіх дзяржаў, у першую чаргу Германіі і Польшчы, у якіх прынцып абразы вялікасці захаваўся ў сваім нязменным выглядзе. Адтуль у XV–XVI стст. адбылася рэцэпцыя інстытута «crimen majestatis» у прававую сістэму ВКЛ, але са значнымі зменамі. У ВКЛ была выпрацавана своеасаблівая тэрміналогія і ўласнае разуменне прынцыпу «crimen majestatis», якія адрозніваліся як ад рымскіх, так і ад заходнееўрапейскіх. На працягу XV–XVI стст. дадзены прававы прынцып змяняўся і ўдакладняўся і быў канчаткова распрацаваны і замацаваны як прававая норма ў Статуце 1588 г.

Спіс выкарыстаных крыніц

1. Прывілей вялікага князя Аляксандра 1492 г. / Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах: у 4 т. / Акад. навук БССР, Ін-т гісторыі. – Мінск: Выд-ва АН БССР, 1936–1954. – Т. 1: IX–XVIII стст. / склад. В. К. Шчарбакоў, К. І. Кернажыцкі, Д. І. Даўгяла. – Мінск, 1936. – 678 с.

2. Статут Великого княжества Литовского 1529 года / Временник Императорского Московского Общества Истории и Древностей Российских. – М., 1854. – Кн. 18. – С. 1–106.

3. Статут Великого княжества Литовского 1566 года / Временник Императорского Московского Общества Истории и Древностей Российских. – М., 1855. – Кн. 23. – С. 1–200.

4. Статут Великого княжества Литовского 1588 года. – Вильно, 1586. – 614 с.

5. *Максимейко, Н. А.* Источники уголовных законов Литовского статута / Н. А. Максимейко. – Киев, 1894. – 186 с.

6. *Бартошек, М.* Римское право: понятия, термины, определения / М. Бартошек. – М., 1989. – 448 с.
7. *Покровский, И. А.* История Римского права / И. А. Покровский. – Минск: Харвест, 2002. – 528 с.
8. *Тацит, К.* Анналы. Малые произведения: сб. / К. Тацит; пер. с лат. А. С. Бобовича; под ред. Я. М. Боровского, М. Е. Сергеенко. – М.: АСТ: Астрель, 2010. – 505 с.
9. *Величко, А. М.* Византийская симфония / А. М. Величко. – М.: Вече, 2013. – 384 с.
10. Дигесты Юстиниана: в 8 т. / редкол.: Л. Л. Кофанов (отв. ред.) [и др.]; пер. с лат. – М.: Статут, 2002–2005. – Т. 7, полутом 2, кн. 48–50. – 564 с.
11. *Вальденберг, В. Е.* Древнерусские учения о пределах царской власти: Очерки русской политической литературы от Владимира Святого до конца XVII века / В. Е. Вальденберг. – М.: Изд. дом «Территория будущего», 2006. – 368 с.
13. *Величко, А. М.* История Византийских императоров. От Константина Великого до Анастасия I. / А. М. Величко. – М.: Вече, 2012. – 592 с.
14. Эклога: Византийский законодательный свод VIII века / пер. вступ. ст. и коммент. Е. Э. Липшица. – М.: Наука, 1965. – 228 с.
15. *Корогодина, М. В.* Взгляды русских канонистов первой половины XVI века на царскую власть (на материале кормчих книг) / М. В. Корогодина // Верховная власть, элита и общество в России XIV – первой половины XIX века. Российская монархия в контексте европейских и азиатских монархий и империй: Вторая междунар. науч. конф., 24–26 июня 2009 г. [Электронный ресурс]. – 2009. – Режим доступа: http://old.kreml.ru/ru/science/conferences/2009/power/thesis/Korogodina. – Дата доступа: 15.02.2015.
16. История отечественного государства и права: в 2 ч. / под ред. О. И. Чистякова. – М.: Юристъ, 2005. – Ч. 1 – 430 с.
17. Российское законодательство X–XX вв.: в 9 т. / под общ. ред. О. И. Чистякова. – М.: Юрид. лит., 1985–1994. – Т. 2. – 520 с.
18. *Ермолович, В. И.* Влияние источников отечественного и зарубежного права на формирование Статута Великого княжества Литовского 1529 г. / В. И. Ермолович // Статут Вялікага княства Літоўскага 1529 г. – падмурак развіцця беларускай дзяржаўнасці і канстытуцыяналізму (да 480-годдзя прыняцця): зб. навук. арт. – Мінск: РІВШ, 2009. – С. 64–71.
19. *Jaskier, M.* Iuris Provincialis Quod Speculum Saxonum vulgo nuncupatur libri tres […] Annotata insuper in marginibus habentur loca legum Iurisq[ue] Municipalis Maideburgen[sis] / M. Jaskier. – Kraków, 1535. – 346 s.
20. Volumina Legum: przedruk zbioru praw staraniem XX pijarow w Warszawie, od roku 1732 do roku 1782: leges, statuta, constitutiones et privilegia regni Poloniae, magni ducatus Lithuaniae, omniumque provinciarum annexarum, a commitiis vislicle anno 1347 celebratis usque ad ultima regni comotia / J. Ohryzko. – Petersburg, 1859. – T. 1. – 288 s.
21. *Balzer, O. M.* Geneza trybunału koronnego: studyum z dziejów sądownictwa polskiego XVI wieku / O. M. Balzer. – Warszawa, 1886. – 347 s.
22. *Музыченко, П. П.* Рецепция римского права в Статутах Великого княжества Литовского / П. П. Музыченко // Статут Вялікага княства Літоўскага 1529 г. – падмурак развіцця беларускай дзяржаўнасці і канстытуцыяналізму (да 480-годдзя прыняцця): зб. навук. арт. – Мінск: РІВШ, 2009. – С. 71–76.
23. *Bardach, J.* Statuty Wielkiego Księstwa Litewskiego – pomniki prawa doby Odrodzenia / J. Bardach // Dzieje kodyfikacji prawa: materiały na konferencie historykow prawa w Karpaczu. – Karpacz, 1974. – S. 41–71
24. Акты Литовской Метрики / Собраные профессором Императорского Варшавского университета Ф. И. Леонтовичем. – Варшава: Тип. Варшав. учеб. округа, 1897. – Т. 1, вып. 2. – 200 с.
25. Статут Вялікага княства Літоўскага 1588. Тэксты. Даведнік. Каментарыі. – Мінск: БелСЭ, 1989. – 573 с.

26. *Савченко, Д. А.* Оскорбление величия по законодательству Великого княжества Литовского / Д. А. Савченко // Историко-правовые проблемы: новый ракурс: сб. науч. работ. – Курск: КГУ, 2014. – Вып. 7. – С. 102–121.
27. *Леонтович, Ф. И.* Литовские господари и центральные органы управления до и после Люблинской унии / Ф. И. Леонтович // Юридические записки, издаваемые Демидовским юридическим лицеем. – 1908. – Вып. 1. – С. 11–60.
28. Документы Московского архива Министерства юстиции / подготовил М. Довнар-Запольский, 1897. – Т. 1. – 569 с.
29. *Kantorowicz, E. H.* Dwa Ciała Króla. Studium ze średniowecznej teologii politycznej / E. H. Kantorowicz. – Warszawa, 2007. – 483 s.
30. *Дыдынский, Ф. М.* Латинско-русский словарь к источникам римского права: по изд. 1896 г. / Ф. М. Дыдынский. – М., 1998. – 372 с.
31. *Малиновский, И. А.* Учение о преступлении по Литовскому статуту / И. А. Малиновский. – Киев, 1894. – 230 с.

(Дата подачи: 19.02.2015 г.)

У. А. Ганскі
Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы, Мінск
U. A. Ganski
National Institute of Higher Education, Minsk

УДК 379.851

ФІСКАЛЬНАЯ ПАЛІТЫКА Ў ДАЧЫНЕННІ ДА СУБ'ЕКТАЎ РЭКРЭАЦЫІ І ТУРЫЗМУ Ў ІІ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ

FISCAL POLICY IN RESPECT OF SUBJECTS OF RECREATION AND TOURISM IN THE SECOND COMMONWEALTH OF POLAND

У артыкуле разглядаецца сістэма падаткаў і збораў, якая прымянялася ў дачыненні да суб'ектаў рынку турысцка-рэкрэацыйных і спадарожных паслуг у міжваеннай Рэчы Паспалітай, комплекс падатковых ільготаў і інвестыцыйных прэферэнцый, закліканых актывізаваць прадпрымальніцкую дзейнасць у сферы рэкрэацыі і турызму; прыводзяцца прыклады рэгіянальных асаблівасцяў фіскальнай палітыкі ў сферы рэкрэацыі і турызму на тэрыторыі Заходняй Беларусі.

Ключавыя словы: падаткі; фіскальная палітыка; турызм; рэкрэацыя; падатковыя ільготы; інвестыцыі; эканамічная гісторыя; ІІ Рэч Паспалітая.

The article considers the system of taxes and levies, which were applied in respect of subjects of the market of tourism, recreation and related services in the interwar period in Second Commonwealth of Poland; examines the complex tax exemptions and investment incentives designed to promote business activity in the field of recreation and tourism; examples of regional features of fiscal policy in the field of recreation and tourism on the territory of West Belarus.

Key words: taxes; fiscal policy; tourism; recreation; tax incentives; investment; economic history; II Rzeczpospolita.

У выніку бурлівых падзей першай чвэрці XX ст. тэрыторыя Беларусі была падзелена мяжой не толькі на дзве дзяржавы, але і на дзве роз-